Святы Дух прабывае ў душы кожнага хрысціяніна

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
04.06.2017 00:00

4 чэрвеня Касцёл адзначае ўрачыстасць Спаслання Святога Духа, якая завяршае велікодны перыяд. Давайце разбяромся, чаму яна з'яўляецца адной з галоўных у літургічным календары, а таксама хто такі Святы Дух і як Ён дзейнічае ў душы верніка. Чаму адзначаем урачыстасць Спаслання Святога Духа?

На 50-ты дзень пасля Уваскрасення Збаўцы ў Іерусаліме ў Сіёнскай святліцы, дзе вучні Езуса сабраліся на малітву, узняўся шум з неба, як павеў моцнага ветру, і на кожным з іх затрымаліся языкі, быццам ад агню (параўн.: Дз 2, 2–3). Як і абяцаў Хрыстос перад сваім унебаўшэсцем, на Апосталаў у выглядзе вогненных языкоў сышоў Святы Дух – Суцяшыцель, які павінен завяршыць справу збаўлення чалавека.

Адчуўшы вялікі прыліў унутраных сіл, натхненне і невымоўную радасць, вучні сталі гучна праслаўляць Бога. Вакол іх сабралася шмат народу. І тут выявілася, што Апосталы загаварылі на невядомых ім мовах. Нягледзячы на тое, які разнастайны быў натоўп, кожны чуў сваю мову. І тады апостал Пётр прамовіў першую пропаведзь, у якой растлумачыў сабраным, што праз спасланне Святога Духа спраўдзілася старажытнае прароцтва. Заклікаў прысутных пакаяцца і прыняць хрост у імя Езуса Хрыста. Да вечара гэтага дня колькасць вернікаў узрасла да 3-ох тысяч чалавек. З таго часу ўрачыстасць Спаслання Святога Духа лічыцца днём нараджэння Касцёла. †

Як ушаноўваем успамін гістарычнай падзеі?

Раней у Італіі ў памяць пра цуд сыходжання вогненных языкоў было прынята раскідваць пялёсткі руж са столі святынь, у сувязі з чым урачыстасць называлася "Pasqua rosatum" ("Вялікдзень руж"). У Францыі падчас набажэнства дзьмулі ў трубы на ўспамін гуку моцнага ветру, які суправаджаў спасланне Святога Духа. У Вялікабрытаніі праводзілі шэсці, так званыя "Whit Walks" ("Духаўскія прагулкі"). Як правіла, у іх удзельнічалі духавыя аркестры і хоры. Дзяўчынкі, якія суправаджалі шэсце, былі апрануты ў белае. Таксама ладзілі "Духаўскія кірмашы", званыя яшчэ "Траецкімі элямі", дзе варылі піва, танцавалі марэску, праводзілі сырныя гонкі і турніры лучнікаў.

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
04.06.2017 00:00

Усе мы павінны складаць еднасць у Езусе Хрысце праз Святога Духа.

Ва ўсходнеславянскай народнай традыцыі ўрачыстасць Спаслання Святога Духа называецца Сёмухай, бо святкуецца ў 7-ую нядзелю пасля Вялікадня. У Беларусі, Расіі, Украіне, Польшчы існуе звычай упрыгожання святынь галінкамі ліставых дрэў (галоўным чынам бука, бярозы, ліпы і лістаўніцы) і палявымі кветкамі на знак таго, што Святы Дух абнаўляе чалавека, дзякуючы чаму ён пачынае расквітаць. У некаторых рэгіёнах Польшчы бытуе традыцыя дэкаравання зелянінай уласных дамоў, т. зв. “маенне”. Гэты звычай асабліва распаўсюджаны ў парафіях, дзе на ўрачыстасць Спаслання Святога Духа прыпадае адпуст.

Кім або чым з’яўляецца Святы Дух?

Некаторыя ўспрымаюць Святога Духа як нейкую фантастычную сілу, безаблічную энергію, руку ці подых Усемагутнага. У Бібліі ясна сцвярджаецца, што Святы Дух – гэта Асоба Бога, які Трыадзіны. Гэтую галоўную праўду наўрад удасца спасцігнуць розумам – трэба прыняць з пакорай. Вельмі важна ў яе паверыць, таму што нельга па-сапраўднаму ўшаноўваць Святога Духа, калі не лічыць Яго Асобай Бога. Праз няпоўнае ўспрыманне боскай таямніцы чалавек ненаўмысна зневажае Тройцу.

Чым яшчэ вернік здольны абразіць Святога Духа? У Катэхізісе Каталіцкага Касцёла пералічаны грахі супраць Яго: грашыць, празмерна спадзеючыся на Божую міласэрнасць; адчайвацца альбо сумнявацца ў Божай ласцы; супраціўляцца спазнанай праўдзе веры; зайздросціць бліжняму, які мае Божую ласку; закамянела трываць у грахах, адкладваць пакаянне аж да смерці.

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
04.06.2017 00:00

[redacted] **пакінуш**

[redacted]